УДК 930 (476):94«1861»

**А. Ф. Рацько,**

*Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка,*
*г. Мінск, alratko@mail.ru*

# АСНОЎНЫЯ ЭТАПЫ ДАСЛЕДАВАННЯ ПЫТАННЯ АБ АДМЕНЕ ПРЫГОНУ Ў БЕЛАРУСІ Ў АЙЧЫННАЙ ГІСТАРЫЯГРАФІІ

*The article gives the analysis of three stages of researching the problem of serfdom abolition in Belarus in domestic historiography. It describes the result of studying the most important aspects of serfdom abolition and shows the necessity and prospects of further research of the topic according to the modern level of historical science.*

*В статье дан анализ трех этапов исследования вопроса о ликвидации крепостничества в Беларуси в отечественной историографии. Подведен итог изучению важнейших аспектов отмены крепостного права, показаны необходимость и перспективы дальнейшего исследования темы в соответствии с современным уровнем исторической науки.*

Адмена прыгоннага права ў 1861 г. стала важнай падзеяй у гісторыі Расійскай імперыі, у тым ліку і Беларусі. Вызваленне сялян аказала моцнае ўздзеянне на лёсы большасці насельніцтва краю і ва многім прадвызначыла характар сацыяльна-эканамічнага і грамадска-палітычнага развіцця на многія дзесяцігоддзі наперад. Вастрыня і нявырашанасць аграрнага пытання былі прычынай пастаяннай увагі айчынных гісторыкаў да гэтай праблемы.

На нашу думку, можна вылучыць тры этапы ў вывучэнні пытання аб адмене прыгону ў Беларусі айчыннымі гісторыкамі: 1) 1920–1940-я гг.; 2) 1950–1980-я гг.; 3) 1990-я гг. – пачатак XXI ст.

На пачатку першага этапу, а дакладней, у 20-я гг. XX ст., адбываецца станаўленне ўласна беларускай гісторыі як самастойнага аб'екта даследавання. З'явіліся першыя працы па аграрнай тэматыцы, у якіх знайшлі адлюстраванне і пытанні ліквідацыі прыгону ў Беларусі. Варта ў першую чаргу нагадаць даследаванні М. Доўнар-Запольскага, У. Пічэты і У. Ігнатоўскага, якія ўнеслі

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

вялікі ўклад у распрацоўку дадзенай праблематыкі. Імі назапашаны значны фактычны матэрыял аб адмене прыгону ў Беларусі.

Адным з першых у беларускай гістарыяграфіі, хто разглядаў рэформу 1861 г. у Беларусі (асноўныя прынцыпы, памеры надзелаў і павіннасцяў сялян, сервітуты), быў У. Пічэта. Вялікую ўвагу гісторык звяртаў на пытанні пераводу былых прыгонных на абавязковы выкуп у 1863 г., яго прычыны, суадносіны выкупных і рынкавых коштаў на зямлю, а таксама фармаванне іншых саслоўных разрадаў сялянства, становішча сялян [14–16].

У 1920–1930-я гг. у гістарыяграфіі ўсталёўваецца адзіна магчымы і дапушчальны марксісцка-ленінскі метадалагічны падыход, у адпаведнасці з якім ва ўсіх гістарычных даследаваннях, прысвечаных сялянству, дамінавала вывучэнне сацыяльна-эканамічных пытанняў і класавай барацьбы [21, с. 45]. Аб'ектыўны ход гісторыі падганяўся пад марксісцкую тэорыю класавай барацьбы як рухаючай сілы прагрэсіўнага грамадскага развіцця. Абапіраючыся на ленінскае вучэнне аб рэвалюцыйнай сітуацыі, зыходзячы з якога рэформа 1861 г. была «пабочным прадуктам рэвалюцыйнай барацьбы» і насіла класава абмежаваны характар, беларускія савецкія гісторыкі ў сваіх даследаваннях вымушаны былі ў першую чаргу раскрываць змест і формы класавай барацьбы сялянства, асабліва яго антыпрыгонніцкія выступленні ў перыяд правядзення рэформы, выяўляць «грабежніцкі характар» заканадаўчых актаў 19 лютага і «антынародную практыку правядзення іх у жыццё». Менавіта ў такім ключы пытанні правядзення рэформы 1861 г. у Беларусі разглядаліся ў работах А. Бурдзейкі і І. Лочмеля [2; 7].

Такім чынам, за 1920–1940-я гг. у беларускай савецкай гістарыяграфіі намеціліся шляхі і прыёмы вывучэння рэформы 1861 г. на падставе марксісцка-ленінскай метадалогіі, былі выяўлены найменей распрацаваныя пытанні. Характэрнай рысай гэтага этапу развіцця гістарыяграфіі быў ухіл да разгляду сялянскага руху напярэдадні і пасля 19 лютага 1861 г. У баку заставаліся пытанні рэалізацыі рэформы.

У 1950–1980-я гг. павялічваецца не толькі колькасць даследаванняў, прысвечаных праблеме адмены прыгону, але і значна

пашыраецца кола пастаўленых пытанняў, вывучэнне якіх стала болей глыбокім і рознабаковым. Увага гісторыкаў паступова перамяшчалася з праблемы падрыхтоўкі рэформы 1861 г. на вывучэнне яе рэалізацыі і ў першую чаргу ўплыву паўстання 1863 г. на ўмовы вызвалення сялян. Як і на папярэднім этапе, важнае значэнне надавалася вывучэнню сялянскага руху. Прыкладам таму могуць быць першыя дысертацыі, у якіх даследавалася правядзенне рэформы 1861 г. у асобных губернях [6; 8; 17].

Першай спробай комплекснага даследавання сацыяльна-эканамічных і палітычных перадумоў рэформы, яе падрыхтоўкі і правядзення ў межах усёй Беларусі стала манаграфія М. Фрыдман «Отмена крепостного права в Белоруссии» [23]. Аднак, як заўважыў М. Улашчык, супярэчнасць крыніц і адсутнасць адзінай методыкі вызначэння памеру надзелаў не дазволілі М. Фрыдман устанавіць рэальную карціну тых зменаў, якія адбыліся ў сялянскім землекарыстанні ў ходзе рэалізацыі рэформы 1861 г. У рабоце не адлюстравана спецыфіка асобных рэгіёнаў Беларусі (усходні, заходні, Палессе), адкуль застаецца незразумелым, чаму ініцыятыва адмены прыгоннага права зыходзіла ад гродзенскіх і віленскіх памешчыкаў, а не ад магілёўскіх [22, с. 17–18].

У канцы 1950–1960-х гг. удасканальваецца методыка даследавання, уводзяцца ў навуковы ўжытак раней невядомыя дакументальныя матэрыялы. Прыкладам таму з'яўляецца праца М.Улашчыка [22], падрыхтаваная на базе шырокага кола архіўных крыніц і аналізу ўсяго спектра аграрнай праблематыкі напярэдадні адмены прыгону – перадумовы и прычыны адмены прыгоннага права, склад насельніцтва, землеўладанне, памешчыцкая і сялянская гаспадаркі, развіццё таварных адносін, сялянскі рух.

У сувязі са 100-годнім юбілеем адмены прыгону і паўстання 1863 г. на беларуска-літоўскіх землях гісторыкі выдалі шэраг работ, у якіх аналізаваліся пытанні рэалізацыі аграрнай рэформы 1861 г. у Беларусі. Сярод іх асобае месца займаюць работы М. Фрыдман, М. Шпакава, У. Хілюты, у якіх паказана дынаміка сялянскага надзельнага землеўладання сямі паветаў Мінскай, а таксама Магілёўскай і Гродзенкай губ. [24–26]. Змяненне зямель-

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

ных надзелаў сялян Беларусі ў выніку рэформы 1861 г. даследаваў В. Мілаванаў [9].

Такім чынам, айчынная гістарыяграфія 1950–1980-х гг. характарызавалася значнымі дасягненнямі ў вывучэнні рэформы 1861 г. у Беларусі, асабліва яе рэалізацыі ва ўсходніх, цэнтральных і заходніх паветах, а таксама аграрнага пытання ў паўстанні 1863 г.

На трэцім этапе вывучэння пытання аб адмене прыгону ў Беларусі (1990-я гг. – пачатак XXI ст.) з'яўляюцца абагульняльныя працы па аграрнай гісторыі, у якіх падрабязна разгледжаны ўвесь спектр дадзенай праблемы [3; 4; 10]. Гісторыкі В. Панюціч, А. Сасім, З. Шыбека, А. Каханоўскі [5; 12; 13; 19; 27] і інш. працягвалі работу па далейшым асэнсаванні розных аспектаў ліквідацыі прыгону на беларускіх землях.

У апошнія гады з'яўляюцца новыя падыходы да вывучэння аграрнай рэформы 1861 г. як у цэлым па Расійскай імперыі, так і па асобных яе рэгіёнах. Некаторыя даследчыкі не згаджаюцца з тым, што ў аснову большасці прац гісторыкаў-аграрнікаў было пакладзена ленінскае палажэнне аб рабаванні сялянства падчас правядзення ў жыццё «Палажэнняў» 19 лютага. Яны падвяргаюць сумненню тое, што збядненне сялян, выклікане малазямеллем і высокімі выкупнымі плацяжамі ў час рэалізацыі рэформы, расло з кожным наступным дзесяцігоддзем і ў канчатковым выніку зрабіла сялян саюзнікам пралетарыяту ў гады першай рэвалюцыі ў Расіі. Выказваецца думка, што малазямелля сялян не было (па крайняй меры, у першыя дзесяцігоддзі пасля рэформы) такім катастрафічным, як гэта адлюстроўвала савецкія гістарыяграфія [18, с. 44]. Сцвярджэнні гісторыкаў аб тым, што сяляне ў выніку рэалізацыі рэформы атрымалі недастатковую колькасць надзельнай зямлі, за якую ім давялося выплачваць надзвычай высокія выкупныя плацяжы, і, каб выжыць, яны вымушаны былі батрачыць на памешчыкаў і шукаць неземляробчыя заробкі, не стасуецца з тым фактам, што ў пасляэрэформенны перыяд былыя прыгонныя выраблялі асноўную, пастаянна ўзрастаючую масу ўсяго сельскагаспадарчага і значную частку рынкавага прадукту.



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Адным з першых у беларускай гістарыяграфіі, хто зрабіў спробу перагледзець тэзіс аб рабаўніцкім характары аграрнай рэформы 1861 г., быў Х. Бейлькін. Спасылаючыся на Ю. Янсана, Х. Бейлькін лічыць, што ў параўнанні з суседнімі расійскімі і ўкраінскімі губернямі душавыя надзелы пасля ўрадавых мерапрыемстваў 1863 г. у пяці заходніх губернях амаль паўсюдна былі большымі, а плацяжы за дзесяціну зямлі ў былых памешчыцкіх сялян – меншымі [1, с. 86]. З'явіліся наватарскія па сваім змесце працы В. Насевіча, С. Токця [11; 20], у якіх назіраецца спроба пераасэнсаваць нашу аграрную гісторыю сярэдзіны XIX – пачатку XX ст., падысці да яе вывучэння з новых, больш сучасных метадалагічных пазіцый.

Варта адзначыць, што шэраг праблем, звязаных з ліквідацыяй прыгону ў Беларусі, патрабуе далейшай распрацоўкі. У прыватнасці, вызначэнне памераў выкупу сялян і плошчы сялянскага надзельнага землеўладання ў беларускіх паветах Віцебскай і Віленскай губерняў. Важным застаецца пытанне, як ліквідацыя прыгону паўплывала на змены ў менталітэце сялян і памешчыкаў, вымушаных кардынальна мяняць метады гаспадарання і прыстасоўвацца да новых умоў функцыянавання іх гаспадарак. Па-за ўвагай даследчыкаў засталіся многія аспекты ўплыву ліквідацыі прыгону на сацыяльна-культурнае жыццё, нацыянальна-палітычныя працэсы, станаўленне ў Беларусі элементаў грамадзянскай супольнасці. Не атрымала асвятлення і праблема ўспрыняцця рэформы вясковай інтэлігенцыяй, духавенствам, яўрэйскімі гандлярамі.

Такім чынам, айчынная гістарыяграфія ліквідацыі прыгону ў Беларусі мае істотныя набыткі, якія складаюць грунтоўны падмурак для сённяшніх даследчыкаў. У той жа час наспела неабходнасць пэўнага пераасэнсавання рэформы 1861 г. з пазіцый і дасягненняў гістарычнай навукі пачатку XXI стагоддзя.

## Спіс выкарыстаных крыніц

1. *Бейлькін, Х. Ю.* Аграрная рэформа 1861 г. у Беларусі і яе асаблівасці / Х. Ю. Бейлькін // Беларус. гіст. часоп. – 2001. – № 1. – С. 82–87.

2. *Бурдзейка, А.* Да пытання аб рэформе 1861 г. на Беларусі / А. Бурдзейка // Запіскі аддз. гуманіт. навук ін-ту беларус. культуры. – Менск. – 1928. – Кн. 3. – Т. II. – С. 451–461.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

3. Гісторыя Беларусі: у 6 т. / Беларусь у складзе Расійскай імперыі (канец XVIII – пачатак XX ст.) / М. Біч [і інш.]; рэдкал.: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: Экаперспектыва, 2005. – Т. 4. – 2005. – 519 с.

4. Гісторыя сялянства Беларусі са старажытных часоў да нашых дзён: у 3 т. / Гісторыя сялянства Беларусі ад рэформы 1861 г. да сакавіка 1917 г. / З. Е. Абезгаўз [і інш.]; пад рэд. В. П. Панюціча. – Мінск: Беларуская навука. – Т. 2.– 2002. – 552 с.

5. *Кахановўскі, А. Г.* Адмена прыгоннага права на тэрыторыі Беларусі: ход рэформы, яе наступствы і значэнне / А. Г. Каханоўскі // Беларус. гіст. часоп. – 2011. – № 10. – С. 10–16.

6. *Короткевич, А. Т.* Отмена крепостного права в Витебской губернии: автореф. дис. … канд. ист. наук / А. Т. Короткевич. – М., 1954. – 18 с.

7. *Лочмель, І.* Адмена прыгоннага права на Беларусі ў 1861 г. / І. Лочмель // Бальшавік Беларусі. – 1939. – № 5. – С. 84–95.

8. *Лысенко, М. Г.* Кризис крепостного хозяйства и реформа 1861 г. в Могилёвской губернии: автореф. дис. ... канд. ист. наук / М. Г. Лысенко; Акад. наук БССР, Ин-т истории. – Минск, 1955. – 25 с.

9. *Мілаванаў, В. А.* Змяненне зямельных надзелаў сялян Беларусі, Літвы і Правабярэжнай Украіны ў выніку рэформы 1861 г. / В. А. Мілаванаў // Вес. Акад. навук БССР. Сер. грамад. навук. – 1962. – № 1–2. – С. 122–134.

10. Нарысы гісторыі Беларусі: у 2 ч. / рэдкал.: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: Беларусь, 1994. – Ч. 1. – 527 с.

11. *Носевич, В. Л.* Традиционная белорусская деревня в европейской перспективе / В. Л. Носевич. – Минск: Тэхналогія, 2004. – 350 с.

12. *Панютич, В. П.* Историография аграрной истории Беларуси 1861–1917 гг. / В. П. Панютич. – Минск: Нац. акад. наук Беларуси, Ин-т истории, 2005. – 262 с.

13. *Панютич, В. П.* Социально-экономическое развитие белорусской деревни в 1861–1900 гг. / В. П. Панютич. – Минск: Наука и техника. 1990. – 378 с.

14. *Пичета, В. И.* Крестьянское и рабочее движение в Белоруссии в эпоху 1905 года / В. И. Пичета // Пр. Беларус. дзярж. ун-та. – 1926. – № 11. – С. 105–127.

15. *Пичета, В. И.* Сялянскія рухі на Беларусі пасля аграрнай рэформы 1861 г. / У. Пічэта // Полымя. – 1929. – № 8–9. – С. 126–153; № 11–12. – С. 208–222.

16. *Пичета, В. И.* История белорусского народа / В. И. Пичета // Курс белоруссоведения: лекции читанные в Белорусском народном университете в Москве летом 1918 года. – М.: Друк. А. П. Яроцкого, 1918–1920. – С. 1–86.

17. *Полонский, А. В.* Крестьянская реформа 1861 г. в Гродненской губернии: дис. … канд. ист. наук / А. В. Полонский. – Минск, 1949. – 273 л.

18. *Реєнт, О. П.* До проблемискасуваннякріпосного права 1861 р. / О. П. Реєнт // Україн. історич. журн. – 2011. – № 1. – С. 34–51.

19. *Сасім, А. М.* Асаблівасці правядзення рэформы 1861 г. на Беларусі / А. М. Сасім // З гісторыі эканамічных рэформаў на Беларусі: вучэб.-метад. зб. /

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Г. П. Бушчык [і інш.]; пад агул. рэд. В. І. Галубовіча. – Мінск: Экаперспектыва, 1997. – Вып. 2. – С. 35–56.

20. *Токць, С.* Беларуская вёска ў эпоху зьменаў: другая палова XIX – першая траціна XX ст. / С. Токць. – Менск: Тэхналогія, 2007. – 30[illegible] с.

21. *Токць, С.* Савецкая гістарыяграфія беларускага сялянства перыяду Расійскай імперыі / С. Токць // Гіст. альм. – 2004. – Т. 10. – С. 45–73.

22. *Улащик, Н. Н.* Предпосылки крестьянской реформы 1861 г. в Литве и Западной Белоруссии / Н. Н. Улащик. – М.: Наука, 1965. – 479 с.

23. *Фридман, М. Б.* Отмена крепостного права в Белоруссии / М. Б. Фридман. – Минск: Изд-во Белорус. гос. ун-та, 1958. – 2[illegible]2 с.

24. *Фридман, М. Б.* Реализация реформы 1861 г. в Минской губернии / М. Б. Фридман // Ежегодник по аграрной истории Восточной Европы. – 1962. – Минск: Наука и техника, 1964. – С. 4[illegible]2–4[illegible]4.

25. *Хилюта, В. А.* Землепользование и землевладение бывших помещичьих крестьян Гродненской губернии в середине XIX века (40-е – начало 70-х гг.): автореф. дис. … канд. ист. наук: 07.00.02 / В. А. Хилюта; Мин. гос. пед. ин-т. – Минск, 1982. – 22 с.

26. *Шпаков, М. Ф.* Реализация реформы 1861 г. в Могилевской губернии / М. Ф. Шпаков // Ежегодн. по аграрной истории Восточной Европы, 1963 г. / Акад. наук Литов. ССР, редкол.: В. К. Яцунский (отв. ред.) [и др.]. – Вильнюс: Минтис, 1964. – С. 5[illegible]9-571.

27. *Шыбека, З.* Нарыс гісторыі Беларусі (1795–2002) / З. Шыбека. – Мінск: Энцыклапедыкс, 2003. – 490 с.

УДК 930.(476)

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ